# УНЕЧАРГОВАЯ ПЯТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ

## ПРАМОВА ДЭПУТАТА Н. Я. НАТАЛЕВІЧА

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета! Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета належыць вырашыць гістарычнае пытанне. Гэта — пытанне далучэння і ўключэння Заходняй Беларусі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Не знаходжу слоў, каб перадаць усю глыбіню цёплых хвалюючых пачуццяў, пачуццяў гарачай, глыбокай любві да нашых адзінакроўных братоў і сясцёр Заходняй Беларусі. І я з вялікай радасцю і шчасцем віншую ў вашай асобе, таварышы члены паўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання, увесь вызвалены народ Заходняй Беларусі.

20 год назад было створана ўродлівае дзіцянё версальскай згоды — польская дзяржава. Яна была створана штучна і гвалтам за кошт тэрыторый Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. І на працягу 20 год польскія паны, як злыя каршуны, катавалі, ірвалі цела нашай роднай адзінакроўнай сястры — Заходняй Беларусі.

Польскія паны і памешчыкі пры «шчырай» дапамозе англійскіх і французскіх штыкоў прынеслі працоўным Заходняй Беларусі разарэнне, голад, зняважу, тэрор і турмы.

Гэта яны, польскія паны, падзялілі Польшчу на дзве часткі — на Польшчу «А» і на Польшчу «Б»—з мэтай бесконтрольнай каланіяльнай эксплаатацыі і грабяжу працоўных мас Заходняй Беларусі.

Гэта яны, польскія паны, знішчылі ўсе беларускія школы, звольнілі і пакінулі без работы беларускіх настаўнікаў і ўсю чэсную працоўную інтэлігенцыю. І вякамі створаную культуру беларускага народа ўтапталі ў бруд сваім смярдзючым ботам.

Гэта яны навязвалі беларускаму народу польскую мову, прымусова праводзячы апалячванне.

Гэта яны лічылі беларускага селяніна хлопам і быдлам і таму адабралі ў яго лепшыя землі і аддалі асаднікам і памешчыкам, разаралі сялян, зрабілі іх вечнымі батракамі «ясновельможных» польскіх паноў, графаў патоцкіх, князей радзівілаў і любамірскіх.

Гэта яны арганізоўвалі яўрэйскія пагромы, захлёбваліся ў крыві яўрэйскага насельніцтва, а таксама працоўных беларусоў і палякаў; будавалі сваё панства на касцях і крыві працоўных.

Польскія ўладары ператварылі Польшчу ў суцэльную турму народаў, у краіну здзекаў, катавання і масавага тэрора.

Здаецца, няма ні аднаго чалавека, ні аднаго працоўнага ў Заходняй Беларусі.

Народнае Сабранне Заходняй Беларусі выразіла волю ўсяго беларускага народа. Працоўныя Заходняй Беларусі праз сваё Народнае Сабранне сказалі сваё моцнае слова, заявілі ўсяму свету аб тым, хто ім даражэй і бліжэй і за якую ўладу яны гатовы біцца, не шкадуючы ні сілы, ні жыцця.

Народы Заходняй Беларусі ва ўвесь свой магутны голас заявілі ўсяму свету аб тым, што ім не трэба ніякай іншай улады, апрача совецкай, што ўлады польскіх памешчыкаў і капіталістаў яны больш не жадаюць і ніколі не на тэрыторыі Заходняй Беларусі не дапусцяць, што ім дарага і люба совецкая ўлада, улада працоўных і што гэтую ўладу яны ніколі, ні за што са сваіх рук не выпусцяць і ні за што і ніколі не нікому не аддадуць.

Народы Заходняй Беларусі прагаласавалі за совецкую ўладу, і гэтая ўлада ўстаноўлена на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Такавы імкненні, жаданні і воля народаў Заходняй Беларусі. Цяжка апісаць хвалюючую карціну Народнага Сабрання. Паэзія бяссільна адлюстраваць усё тое, што мы бачылі і чулі на гэтым Сабранні. Няма сілы перадаць радасць, і нянавісць працоўных мас да памешчыкаў і капіталістаў, іх вялікую радасць, любоў да народаў Совецкай краіны, да партыі большэвікоў і да вялікага і мудрага нашага бацькі і правадыра таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

На Сабранні дэпутаты хваляваліся, смяяліся і плакалі. Гэтыя слёзы былі слязамі вялікага шчасця і радасці, падзякі вялікаму магутнаму совецкаму народу за дапамогу. Яны плакалі ад радасці і вялікага чалавечага пачуцця.

Народнае Сабранне аднагалосна пастанавіла: утварыць совецкую ўладу ў Заходняй Беларусі, далучыць тэрыторыю Заходняй Беларусі да Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, да Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, канфіскаваць памешчыцкія землі, нацыяналізаваць банкі і буйную прамысловасць. Народнае Сабранне поўнасцю і да канца выказала волю свайго народа.

Страшнае, праклятае мінулае панскай Польшчы кануло ў вечнасць. Гэтыя гвалтаўнікі народа выкінуты на задворкі гісторыі. Мне здаецца, што пасля гэтага было-б выключным глупствам і бязглуздзіцай з боку англійскага і французскага ўрадаў працягваць імперыялістычную

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы